Важно отметить, что книга написана еще во время работы собора – в 1666 г. – и была одобрена его участниками, которые признали: «Сооружи освященный собор новую книгу, Жезл Правления именованную, в ней же вся подробну клеветы и обличения возобличаются: в первой части Никитино буйствование отражается, во второй окаянного Лазаря безумие объявляется и хулы его Жезлом из чистого сребра Божия слова и от священных Писаний и правильных

виНословий сооруженным, посекаются»[48].

Поэтому следует объяснять жесткую и бескомпромиссную позицию «Жезла правления» в отношении старообрядцев не точкой зрения на этот вопрос лично Симеона Полоцкого, а теми жесткими мерами против старообрядцев, которые были поддержаны собором[49].

Книга представляет собой, с одной стороны, произведение полемической религиозной литературы с соответствующей аргументацией и подачей материала, а с другой – изложение постановлений и решений Большого Московского церковного собора 1666–1667 гг. В связи с необходимостью выполнения этих двух функций автором были определены структура и содержание книги.



*Спасский собор Заиконоспасского монастыря в Москве*

*Спаскі сабор Заіконаспаскага манастыра ў Маскве*

*Spassky Cathedral of the Zaikonospassky Monastery in Moscow*

Действительно интересным может быть сравнение «Жезла правления» с произведениями полемической литературы, традиции которой были очень богатыми в Беларуси, на родине Симеона Полоцкого. Еще в XVI в. на землях Беларуси, Литвы и Украины велась активная богословская дискуссия, важнейшим элементом которой стал выпуск многочисленных полемических изданий. Благодаря этому на протяжении последнего десятилетия XVI в., когда была подготовлена и заключена Брестская церковная уния, в Беларуси было напечатано более половины всех кириллических изданий восточнославянского мира![50] Участники той дискуссии прекрасно понимали силу и значение полемической литературы как важного оружия в межконфессиональной борьбе. В дальнейшем в Беларуси даже самые сложные конфликты решались обычно не при помощи оружия (белорусская история почти не знает религиозных восстаний, инквизиции, кровавых войн про-

[48] *Татарский И.* Симеон Полоцкий (его жизнь и деятельность): опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII в. – Москва : Типография М. Г. Волчанинова, 1886. – С. 80.

[49] *Майков Л. Н.* Очерки из истории русской литературы XVII и XVIII столетий. – Санкт-Петербург: издание А. С. Суворина, 1889. – С. 37 ; *Филиппов С.* Раскол в русской церкви и юго-западная ученость // Studia Russica / adiuvante B. Tatar, redigit A. Zoltan. – Budapest, 2000. – Т. 18. – С. 69.

[50] *Исаевич Я. Д.* Преемники первопечатника. – Москва : Книга, 1981. – С. 165.




*Учебный процесс в Москве в XVII в. Гравюра из «Азбуки» Василия Бурцова (Москва, 1637) – первого московского пособия для обучения грамоте*

*Навучальны працэс у Маскве ў XVII ст. Гравюра з «Азбукі» Васіля Бурцова (Масква, 1637) – першага маскоўскага дапаможніка для навучання грамаце*

*The educational process in Moscow in the XVII century. Engraving from ABC-book by Vasily Burtsov (Moscow, 1637) – the first Moscow handout for training reading and writing*

тив иноверцев), а благодаря яркому художественному слову, научной или богословской аргументации. Полемическая литература была главным оружием наших предков. Наибольший ее подъем пришелся на конец XVI – начало XVII в.

Воспитанный на белорусских, украинских и польских литературных традициях Симеон Полоцкий продолжил их развитие в Российском государстве. Поэтому есть все основания считать «Жезл правления» произведением полемической литературы. Недаром один из первых и наиболее компетентных исследователей творчества Симеона Полоцкого И. Татарский еще в XIX в. назвал книгу «Жезл правления» одним из важнейших явлений российской полемической литературы против раскола[51].

Основной задачей «Жезла правления» была критика церковного раскола и старообрядцев. Потому это произведение часто называют антистарообрядческим трактатом[52], богословским трактатом, направленным против патриарха Никона и вождей раскола[53], работой-обвинением раскола, основным духовным оружием против раскола[54].

Свои доводы просветитель основывал на доказательствах и логичности рассуждений, что тогда иногда воспринималась как новации и «латинство». Симеон Полоцкий постоянно призывал к использованию разума, рациональных рассуждений. Он упрекал российских церковных деятелей в необразованности и отсутствии достаточных знаний: «Безумию их каждый посмеется». Именно к размышлениям и рассуждениям призывает и своего читателя: «Молю тя, здравым умом да судиша».

Естественно, что учение православной церкви в дальнейшем также претерпело некоторые изменения. В частности, решением собора 1690 г. был пересмотрен вопрос о времени преложения Святых Даров (превращения хлеба и вина в тело и кровь Христа). Соответственно некоторые соборные решения, закре-

[51] *Татарский И.* Симеон Полоцкий (его жизнь и деятельность): опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII в. – Москва : Типография М. Г. Волчанинова, 1886. – С. 81.

[52] Большая энциклопедия : в 62 т. / [главный редактор С. А. Кондратов]. – Москва : Терра, 2006. – Т. 45. – С. 214.

[53] Большая советская энциклопедия : [в 30 т.] / главный редактор А. М. Прохоров. – 3-е изд. – Москва : Советская энциклопедия, 1976. – Т. 23. – С. 389 ; Краткая литературная энциклопедия : [в 9 т. / главный редактор А. А. Сурков]. – Москва : Советская энциклопедия, 1971. – Т. 6. – Стб. 841.

[54] *Варатнікова А. А.* Канфесійная палеміка ў творах Сімяона Полацкага // Барока ў беларускай культуры і мастацтве : зборнік / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [навуковы рэдактар В. Ф. Шматаў]. – 3-е выд. – Мінск, 2005. – С. 295.

пленные в книге «Жезл правления», тоже менялись со временем. Примечательно, что это часто становилось причиной для личной критики в адрес Симеона Полоцкого как «латинника». Однако, во-первых, изложенные в книге позиции были одобрены православным собором, а не имели авторский характер. Во-вторых, критика Симеона Полоцкого была вызвана персональной нелюбовью к нему со стороны старообрядцев и некоторых православных архиереев, таких как патриарх Иоаким, при котором проводился собор 1690 г. и который при жизни Симеона был в тени славы полоцкого иеромонаха.

Поэтому и после смерти Симеона Полоцкого не раз появлялись критические выпады в его адрес и в сторону подготовленного им «Жезла правления», но это никак не уменьшило славу знаменитого полочанина, а книга никогда не выходила из употребления, переиздавалась в дальнейшем и воспринималась как официально одобренная собором позиция относительно сущности православия.

## Судьба наследия просветителя и его возвращение

После смерти Симеона Полоцкого, когда незаметные ранее в тени его учености и завистливые к его статусу при дворе православные деятели пытались взять реванш, некоторые его книги были запрещены как насыщенные «латинской мудростью», а рукописи спрятаны в патриаршей ризнице.

Тем не менее произведения просветителя продолжали издаваться и переиздаваться в XVII–XIX вв. Так, например, сборники «Обед душевный» и «Вечеря душевная» выпустил сразу после смерти писателя его ученик и последователь Сильвестр Медведев – соответственно в 1681 и 1683 гг.[55] Переиздавался и «Жезл правления»: в 1753 г. он вышел из печати в Московской синодальной типографии.

В XVIII–XIX вв. отдельные произведения Симеона Полоцкого изредка публиковались в различных научных сборниках и хрестоматиях, которые давно стали библиографической редкостью. Существенное повышение интереса к творчеству полоцкого иеромонаха наблюдалось в XX в., когда одно за другим выходили собрания его сочинений и исследования, посвященные жизни и деятельности просветителя.

Много стихотворных и прозаических произведений, живописных и графических работ посвятили просветителю писатели и художники. Скульптурный памятник Симеону стоит в его родном городе Полоцке. В 1994 г. в здании бывшего Полоцкого Богоявленского монастыря был создан и успешно действует до настоящего времени Музей-библиотека Симеона Полоцкого[56]. Учреждена Международная литературная премия им. Симеона Полоцкого. С целью более глубокого изучения его жизни и творчества был проведен целый ряд научных конференций. Традиционной уже стала конференция «Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность», которая

[55] *Званарова Л.У., Конан У.М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 383.

[56] *Шумовіч А.У.* Экспазіцыя Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага як адлюстраванне жыцця і дзейнасці Сімяона Полацкага // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць : (матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 19–20 лістапада 2009 г.) : да 380-годдзя Сімяона Полацкага / [укладальнікі: А. У. Шумовіч, В. А. Шульчанка]. – Полацк, 2010. – С. 207–215.

каждые пять лет проходит на родине просветителя – в городе Полоцке. Произведения Симеона входят в обязательную программу по литературе для учащихся средних и высших учебных заведений Беларуси. Одним словом, память о Симеоне Полоцком в Беларуси свято сохраняется. Помнят его свершения также в России и Украине. В 1980 г. ЮНЕСКО включила имя Симеона Полоцкого в календарь памятных дат этой организации.

Со времени творческой деятельности полоцкого просветителя прошло несколько столетий. В результате довольно драматического, насыщенного многочисленными войнами и восстаниями исторического развития Беларуси на родине Симеона Полоцкого осталось очень мало его изданий. Как свидетельствуют исследователи, подавляющее большинство культурных памятников Беларуси либо было уничтожено, либо находятся за пределами нашей страны. Первые издания трудов Симеона Полоцкого хранятся только в нескольких крупных библиотеках республики – прежде всего в Национальной библиотеке Беларуси, Центральной научной библиотеке им. Я. Коласа Национальной академии наук Беларуси и Президентской библиотеке Республики Беларусь. Безусловно, государственные библиотеки ведут работу по изучению, поиску, описанию, получению цифровых и печатных копий, а также приобретению оригиналов этих изданий в свои собрания. Однако далеко не все можно сделать только собственными усилиями.

В связи с этим приобретает большое значение сотрудничество государственных учреждений с зарубежными партнерами, общественными организациями и частными компаниями. Его результаты уже довольно значительны. Что касается книги «Жезл правления» Симеона Полоцкого, то нужно вспомнить передачу губернатором Нижегородской области Российской Федерации Валерием Шанцевым копии этого издания в собрание Национальной библиотеки Беларуси, которая состоялась в рамках Первого белорусско-российского экономического форума и Года культуры России в Беларуси в 2005 г.

Достойным продолжением и действительно важным событием в культурной жизни Беларуси стало возвращение в страну оригинального издания «Жезла правления», которое было осуществлено Белгазпромбанком в 2013 г. Акция состоялась в рамках масштабного проекта «Арт-Беларусь», направленного на возвращение в республику культурных ценностей, которые находятся за рубежом.

Следующим этапом этого проекта является данное факсимильное воспроизведение «Жезла правления», которое позволит более широкой аудитории познакомиться с этим уникальным книжным памятником – произведением религиозной и морально-воспитательной литературы. Важно, что переиздание осуществляется в двух томах. Первый том включает качественное факсимильное воспроизведение оригинального издания. Факсимиле позволяет максимально аутентично воссоздать внешний вид и оригинальную структуру книги, сохранив приобретенные со временем отличительные черты конкретного экземпляра. Во втором томе помещены научный очерк о значении «Жезла правления» и публикация его текста, в том числе в переводе на современные русский и белорусский языки.

Мы уверены, что благодаря этому изданию удастся вернуть в культурное пространство Беларуси и России один из наиболее ценных книжных памятников нашего общего прошлого.

# ПЕРШАЯ КНІГА СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

Асоба Сімяона Полацкага – адна з найярчэйшых у гісторыі культуры не толькі Беларусі, яле і ўсяго ўсходнеславянскага свету ў XVII ст. Ён увасобіў у сабе таленты паэта, драматурга, перакладчыка, публіцыста, педагога, філосафа, тэолага, прапаведніка, бібліяфіла, грамадскага і царкоўнага дзеяча.

Калі Францыска Скарыну заслужана лічаць самым вядомым прадстаўніком эпохі Адраджэння ў Беларусі, то Сімяон Полацкі ўпэўнена можа быць названы найбольш прадстаўнічым творцам эпохі Барока, прычым не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

Дзейнасць Сімяона Полацкага звычайна ацэньваецца даследчыкамі вельмі пазітыўна. Аўтары навуковых работ і энцыклапедычных артыкулаў называлі яго чалавекам шматбакова адораным і шырока вядомым творцам[1], «адным з самых культурных людзей свайго часу»[2], найбуйнейшым паэтам XVII ст.[3], «першым у рускай літаратуры пісьменнікам-прафесіяналам»[4], «заснавальнікам паэ-тычнага і драматычнага жанраў»[5], «таленавітым паэтам, драматургам і прапаведнікам»[6], «выдатным паэтам-гуманістам і асветнікам»[7], «адным з найбольш відных прадстаўнікоў гуманізму»[8], «вялікім сынам Беларусі»[9] і г. д. Іншыя ўпэўнена сцвярджаюць, што ён упісаў адну з самых яркіх старонак у развіццё беларускай і расійскай культур[10] і стаў «адным з самых бліскучых прадстаўнікоў беларускай і рускай культуры XVII ст.»[11].

[1] *Шикман А. П.* Деятели отечественной истории : Биогр. слов.-справ. : в 2 кн. – Москва ; Назрань : АСТ, 1997. – [Кн. 2]: Л – Я. – С. 264.

[2] *Шикман А. П.* Деятели отечественной истории : Биогр. слов.-справ. : в 2 кн. – Москва ; Назрань : АСТ, 1997. – [Кн. 2]: Л – Я. – С. 264.

[3] *Прашковіч М. І.* Беларуская паэзія канца XVI – пачатку XVII ст. // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1964. – № 2. – С. 87.

[4] *Шикман А. П.* Деятели отечественной истории : Биогр. слов.-справ. : в 2 кн. – Москва ; Назрань : АСТ, 1997. – [Кн. 2]: Л – Я. – С. 264.

[5] Краткая литературная энциклопедия : [в 9 т. / главный редактор А. А. Сурков]. – Москва : Советская энциклопедия, 1971. – Т. 6. – Стб. 842 ; *Прашковіч М. І.* Вялікі сын Беларусі: да 300-годдзя пераезду Сімяона Полацкага ў Маскву // Беларусь. – 1964. – № 6. – С. 28.

[6] Краткая литературная энциклопедия : [в 9 т. / главный редактор А. А. Сурков]. – Москва : Советская энциклопедия, 1971. – Т. 6. – Стб. 842.

[7] *Прашкович Н. И.* Поэзия Симеона Полоцкого: ранний период (1648–1664) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата филологических наук / Академия наук Белорусской ССР, Институт литературы им. Я. Купалы. – Минск, 1964. – С. 3.

[8] *Прашковіч М. І.* Старонка даўняй беларускай паэзіі // Полымя. – 1964. – № 6. – С. 166.

[9] *Прашковіч М. І.* Вялікі сын Беларусі : да 300-годдзя пераезду Сімяона Полацкага ў Маскву // Беларусь. – 1964. – № 6. – С. 28.

[10] *Прашкович Н. И.* Поэзия Симеона Полоцкого: ранний период (1648–1664) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата филологических наук / Академия наук Белорусской ССР, Институт литературы им. Я. Купалы. – Минск, 1964. – С. 3.

[11] *Прашковіч М. І.* Вялікі сын Беларусі : да 300-годдзя пераезду Сімяона Полацкага ў Маскву // Беларусь. – 1964. – № 6. – С. 28.

Сучаснікі дзівіліся з працавітасці Сімяона Полацкага і выніковасці яго працы: за 16 гадоў дзейнасці ў Маскве ім было напісана больш за 10 кніг. Вялікі асветнік, ён заўсёды імкнуўся дзяліцца з людзьмі сваімі ведамі. Дзеля гэтага адкрыў у царскім палацы друкарню, сабраў адну з найбуйнейшых бібліятэк у Расіі і завяшчаў яе жыхарам трох блізкіх яму гарадоў – Полацка, Кіева і Масквы.

Але ў кожнай справы ёсць свой пачатак, свае вытокі. Першай падрыхтаванай і надрукаванай Сімяонам Полацкім кнігай, якая адразу ж прынесла славу яе аўтару, зрабіла яго вядомым у свецкіх і царкоўных колах расійскага грамадства, стала праца «Посах кіравання» («Жезл правления»). Факсімільнае і тэкставае выданне гэтай кнігі шаноўны чытач як раз трымае ў сваіх руках.

## Ад Полацка да Масквы: пяцідзесяцігадовы жыццёвы шлях Сімяона Полацкага

Сімяон Полацкі (сапраўднае імя Самуіл Пятроўскі-Сітніяновіч) нарадзіўся ў старажытным беларускім горадзе Полацку ў 1629 г. Ён паходзіў, як мяркуюць даследчыкі, з купецкага саслоўя. У архіўных «роспісах двароў палачан» род Пятроўскіх пазначаны поруч са Скарынамі і Цяпінскімі[12]. Першапачатковую адукацыю, верагодна, атрымаў у родным горадзе, які меў даўнія традыцыі адукацыйнай і асветніцкай дзейнасці.

Паміж 1637 і 1651 гг. Сімяон вучыўся ў Кіева-Магілянскай калегіі, якая лічылася лепшай праваслаўнай навучальнай установай Усходняй Еўропы. Сярод яго настаўнікаў былі выдатныя вучоныя і пісьменнікі Пётр Магіла (заснавальнік школы і яе першы рэктар), Сільвестр Косаў, Лазар Барановіч, Інакенцій Гізель, Епіфаній Славінецкі і інш. У час вучобы Сімяона Полацкага ў Кіева-Магілянскай калегіі (яна мела 8 класаў: 4 малодшыя, 2 сярэднія і 2 старэйшыя) выкладаліся славянская, грэчаская, лацінская і польская мовы, граматыка, тэарэтычная і практычная рыторыка, паэтыка, у тым ліку практыка вершаскладання, філасофія, арыфметыка, геаметрыя, астраномія, музыка, багаслоўе. У канцы навучальнага года наладжваліся публічныя дыспуты, на якіх студэнты выступалі з казаннямі на роднай мове і на латыні, чыталі напісаныя пад кіраўніцтвам настаўнікаў вершы, спрачаліся на філасофскія і багаслоўскія тэмы[13].

У першай палове 1650-х гг., як мяркуюць даследчыкі, Сімяон Полацкі перабраўся ў Вільню – сталіцу Вялікага Княства Літоўскага, моцнай беларуска-літоўскай дзяржавы, якая за стагоддзе да гэтага аб'ядналася з Польскім Каралеўствам у канфедэратыўную Рэч Паспалітую. Тут ён пачаў навучанне ў Віленскай езуіцкай акадэміі – першай вышэйшай навучальнай установе ў Вялікім Княстве Лі-

[12] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 379.

[13] *Андриенко Л. О.* Языковая личность Симеона Полоцкого // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць : матэрыялы II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 18–19 лістапада 2004 г. : да 375-годдзя Сімяона Полацкага / укладальнікі: А. У. Шумовіч, В. А. Шульчанка. – Полацк : НПГКМЗ, 2005. – С. 6; *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 379.



*Царь Федор Алексеевич, ученик Симеона Полоцкого. Литография XIX в.*

*Цар Фёдар Аляксеевіч, вучань Сімяона Полацкага. Літаграфія XIX ст.*

*Tsar Theodore Alekseevich, a student of Simeon Polotsky. Lithography of XIX century*

тоўскім. Яна ўзнікла ў 1570 г. у Вільні, большасць насельніцтва якой складалі беларусы, і хутка стала галоўным цэнтрам адукацыі, навукі і асветы ў краі. Да нашага часу захаваліся запісаныя Сімяонам канспекты курсаў лекцый віленскіх філосафаў і тэолагаў. У Вільні Сімяон Полацкі вывучаў рыторыку, тэарэтычную і практычную паэтыку, натурфіласофію і этыку. Рыторыку выкладаў вядомы прафесар Сігізмунд Лаўксмін, а курсы паэтыкі і антычнай культуры грунтаваліся на фундаментальных працах новалацінскага паэта і тэарэтыка літаратуры Мацея Сарбеўскага[14]. На той час апрача роднай беларускай Сімяон Полацкі ўжо настолькі дасканала авалодаў лацінскай, царкоўнаславянскай і польскай мовамі, што пісаў на ўсіх чатырох вершы, прамовы, пропаведзі, навуковыя працы.

На думку многіх даследчыкаў, у віленскі перыяд Сімяон Полацкі ўступіў ва ўніяцкі ордэн базыльян (ордэн Васіля Вялікага)[15]. Сярод іншага пра гэта сведчаць уладальніцкія запісы, якія Сімяон Полацкі пакінуў на кнігах з асабістай бібліятэкі («Ex libris Simeonis Piotrowskj Sitnianowicz hieromonachi Polocens. Ord. S. Bas. M.»[16]), вялікі інтарэс да адукацыйнай дзейнасці, а таксама схільнасць да сінтэзу традыцый хрысціянскага Усходу («праваслаўнага свету») і хрысціянскага Захаду («свету каталіцкага»). Апошняе ў найбольшай меры адпавядала характару культуратворчай дзейнасці ўніяцкай царквы.

Паводле ўмоў Брэсцкай уніі 1596 г. праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай была перападпарад-

[14] *Званарова Л. У.*, Конан У. М. Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 379.

[15] *Варатнікова А. А.* Канфесійная палеміка ў творах Сімяона Полацкага // Барока ў беларускай культуры і мастацтве : зборнік / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; [навуковы рэдактар В. Ф. Шматаў]. – 3-е выд. – Мінск, 2005. – С. 295 ; Республика Беларусь : энциклопедия: [в 6 т.] / редколлегия: Г. П. Пашков (главный редактор) [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. – Т. 6. – С. 656.

[16] *Корзо М.* Внешняя традиция как источник вдохновения. К вопросу об авторстве киевских и московских православных текстов XVII в. Два примера // Studi Slavistici. – 2009. – VI. – S. 72–73.



*Царица Софья Алексеевна, ученица Симеона Полоцкого. Литография XIX в.*

*Царыца Соф'я Аляксееўна, вучаніца Сімяона Полацкага. Літаграфія XIX ст.*

*Princess Sofya, a student of Simeon Polotsky. Lithography of XIX century*

кавана ад Канстанцінопальскага патрыярха, які часткова страціў свой уплыў і аўтарытэт пасля падзення Візантыі, патрыярху (папу) Рымскаму. Пры гэтым царква захоўвала аўтаномію і абраднасць у адпаведнасці з уласнай традыцыяй. Гэту царкву прынята сёння называць уніяцкай.

Асаблівасцю культуратворчай дзейнасці ўніяцкай царквы ў Беларусі на працягу ўсяго перыяду яе існавання з'яўлялася пастаянная апора на дзве традыцыі – усходнюю і заходнюю. Царква шырока выкарыстоўвала культурную спадчыну праваслаўнай царквы Вялікага Княства Літоўскага, адстойвала права на захаванне ўсходнехрысціянскіх абрадаў і догматаў, падтрымлівала культурныя сувязі з Расіяй і іншымі праваслаўнымі краінамі, актыўна выкарыстоўвала працу творцаў з гэтых рэгіёнаў. У той жа час інтэнсіфікацыі заходняга ўздзеяння на культуратворчы працэс ва ўніяцкім асяроддзі спрыяла больш актыўнае ўзаемадзеянне з заходнехрысціянскімі краінамі, каталіцкімі манаскімі ордэнамі, запрашэнне заходнееўрапейскіх майстроў, пашырэнне выкарыстання польскай і лацінскай моў, павелічэнне цікавасці да еўрапейскай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі, распаўсюджанне барочных уплываў і інш. У выніку сінтэзу традыцый Усходу і Захаду культуратворчая дзейнасць царквы суправаджалася стварэннем новых форм, што абумовіла самабытны і непаўторны характар яе культурнай спадчыны. Імкненне да сінтэзу традыцый Усходу і Захаду яскрава праявілася і ў творчасці Сімяона Полацкага.

Скончыць адукацыю ў Віленскай акадэміі Сімяону не дазволіла распачатая ў 1554 г. вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй і захоп Вільні ў 1655 г. Падчас вайны юнак пераехаў у родны Полацк, дзе ў 1656 г. уступіў у Полацкі Богаяўленскі манастыр пад імем Сімяона (мянушку «Полацкі» ён атрымаў пазней у Маскве) і настаўнічаў у брацкай школе пры манастыры. Пасля захопу Полацка ў 1656 г. Сімяон вітаў цара Аляксея Міхайлавіча вершамі

(«Полацкія метры») у выкананні 12 сваіх вучняў.

Ваенныя дзеянні стваралі ў беларускім грамадстве адчуванне набліжэння канца свету. Вайна працягвалася надзвычай доўга – да 1667 г. – і закончылася Андрусаўскім перамір'ем, паводле якога да Расіі былі далучаны Левабярэжная Украіна і Смаленшчына, астатнія ж землі Вялікага Княства Літоўскага (у тым ліку большасць беларускіх земляў) засталіся ў складзе Рэчы Паспалітай. Для Беларусі вайна мела жахлівыя наступствы: было знішчана каля трэці яе насельніцтва (а на Полаччыне – больш паловы), разбурана эканоміка, разрабавана культурная спадчына…



*Царевич Петр Алексеевич, будущий император Петр I*

*Царэвіч Пётр Аляксеевіч, будучы імператар Пётр I*

*The prince Peter Alekseevich, prospective Emperor Peter I*

Палітычная эліта шукала выратавання ў заключэнні саюзаў з суседнімі дзяржавамі – Швецыяй, Прусіяй, Расіяй. Сімяон Полацкі бачыў перспектыву ў больш цесным узаемадзеянні менавіта з Расіяй. Таму, калі ў ліпені 1656 г. маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч прыбыў з войскам у Полацк, полацкі манах вітаў яго хвалебнымі метрамі – тэатралізаванымі сілабічнымі вершамі, якія зачыталі вучні паэта, праслаўляючы «вызваліцеля» беларускай зямлі, спадчынніка «польскай кароны»[17].

Непрыхаванае хвалебнае ўслаўленне прыйшлося цару і яго прыдворным даспадобы, таму Сімяону заказалі яшчэ адзін цыкл падобных панегірычных вершаў («Віцебскія метры»). Чарговыя вершаваныя вітанні цара былі агучаны падчас наведвання Сімяонам у 1660 г. Масквы. Прыгожая паэзія, заснаваная па прынцыпе чаргавання, распаўсюджаным у Расіі, уражвала слухачоў.

Каб пазбегнуць магчымага пераследу за падтрымку ворага ў вайне, Сімяон у 1664 г. (ці яшчэ ў другой

[17] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 381.

палове 1663 г.[18]) канчаткова пераехаў у Маскву, дзе яго здольнасці адразу былі высока ацэнены і запатрабаваны. Тут ён пачаў займацца стварэннем школы новага тыпу для падрыхтоўкі служачых Прыказа тайных спраў – будучых чыноўнікаў, дыпламатаў, перакладчыкаў і інш.[19]. У 1665–1668 гг. ён непасрэдна кіраваў працай гэтай школы. У Маскве, дзе перад тым існавала толькі «элементарная адукацыя, якая набывалася пераважна шляхам чытання», сапраўдным прарывам выглядала з'яўленне школы, якая «адпавядала патрабаванням вышэйшай, ці прынамсі сярэдняй адукацыі»[20]. Ёсць сур'ёзныя падставы меркаваць, што асноўныя прынцыпы арганізацыі працэсу навучання ў гэтай школе былі запазычаны Сімяонам Полацкім з практыкі навучальных устаноў, якія існавалі ў яго на радзіме. Выпускнікамі гэтай школы былі такія вядомыя дзеячы рускай культуры, як паэт і царкоўны дзеяч Сільвестр Мядведзеў і стваральнік цудоўнага вершаванага «Буквара» Карыён Істомін[21]. У гэты перыяд Сімяон Полацкі блізка пазнаёміўся з мітрапалітам Газы – вучоным грэкам Паісіем Лігарыдам, які быў дарадцам цара па царкоўных справах. Гэта дазволіла Сімяону паглыбіцца ў справы царскага двара, далучыцца да складанай царкоўнай дыскусіі і рэформы, што была звязана з дзейнасцю патрыярха Нікана. У гэтым кантэксце вялікае значэнне меў удзел Сімяона Полацкага ў працы Вялікага Маскоўскага сабора 1666–1667 гг. У той жа час яго ўсё часцей пачалі запрашаць на прыдворныя ўрачыстасці, дзе паэт зачытваў свае вершаваныя прынагодныя віншаванні[22].

Адукацыйная дзейнасць, якая з'яўлялася найбольш значнай для ордэна базыльян, стала галоўнай задачай і для Сімяона Полацкага, якога афіцыйна прызначылі выхавацелем царскіх дзяцей. Ён асабіста вучыў спадкаемцаў трона царэвічаў Аляксея ды Фёдара, царэўну Соф'ю, а таксама даглядаў за выхаваннем царэвіча Пятра, які ў далейшым стаў імператарам Пятром Вялікім. У гэтым кантэксце можна меркаваць, што трансфармацыя грамадскага і культурнага жыцця ў Расіі, еўрапеізацыя самой Расіі ў часы Пятра I былі выкліканы ў тым ліку і педагагічнай дзейнасцю манаха Сімяона з Полацка. За год да смерці Сімяон Полацкі працаваў над праектам рускай вышэйшай школы (акадэміі) на ўзор Кіева-Магілянскай акадэміі. Мелася на ўвазе выкладанне ў ёй не толькі грэчаскай мовы і багаслоўя, але ідасягненняў еўрапейскай гуманітарнай навукі і культуры, лацінскай мовы і натурфіласофіі[23].

[18] *Татарский И.* Симеон Полоцкий (его жизнь и деятельность): опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII в. – Москва : Типография М. Г. Волчанинова, 1886. – С. 64–65.

[19] *Майков Л. Н.* Очерки из истории русской литературы XVII и XVIII столетий. – Санкт-Петербург : издание А. С. Суворина, 1889. – С. 17.

[20] *айков Л. Н.* Очерки из истории русской литературы XVII и XVIII столетий. – Санкт-Петербург : издание А. С. Суворина, 1889. – С. 18 ; *Татарский И.* Симеон Полоцкий (его жизнь и деятельность): опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII в. – Москва : Типография М. Г. Волчанинова, 1886. – С. 71.

[21] *Прашковіч М. І.* Вялікі сын Беларусі: да 300-годдзя пераезду Сімяона Полацкага ў Маскву // Беларусь. – 1964. – № 6. – С. 28.

[22] *Майков Л. Н.* Очерки из истории русской литературы XVII и XVIII столетий. – Санкт-Петербург : издание А. С. Суворина, 1889. – С. 17 ; *Татарский И.* Симеон Полоцкий (его жизнь и деятельность): опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII в. – Москва : Типография М. Г. Волчанинова, 1886. – С. 78–79.

[23] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 382.

У канцы 1678 г. Сімяон адкрыў у Крамлі непадкантрольную патрыярху друкарню, якую прынята называць «Верхняй», бо яна знаходзілася на верхнім паверсе царскага палацавага будынка. Гэта падзея мае выключную значнасць у гісторыі культуры Расіі, дзе да таго часу працавалі адзінкавыя друкарні (для параўнання, у роднай Сімяону Рэчы Паспалітай, у тым ліку на беларускіх землях дзейнічалі 134 друкарні). Гэта стварыла падставы для развіцця навукі і літаратуры, а таксама для паслаблення царкоўнай цэнзуры.

Для працы ў друкарні Сімяон Полацкі запрасіў мастакоў і майстроў гравюры[24]. Многія з іх, як мяркуецца, мелі беларускае паходжанне. Такое ж паходжанне было і ў абсталявання друкарні. Справа ў тым, што падчас вайны Расіі з Рэччу Паспалітай з беларускіх земляў на ўсход было перавезена вельмі шмат насельніцтва (асабліва кваліфікаваных рамеснікаў і майстроў) і матэрыяльных каштоўнасцей. Сярод іншага, у 1654 г. былі вывезены абсталяванне і майстры знакамітай друкарні Куцеінскага манастыра пад Оршай[25]. Пасля некалькіх гадоў яе дзейнасці ў Іверскім манастыры на Валдаі і спробаў арганізаваць яе працу ў Новаіерусалімскім манастыры на Істры абсталяванне друкарні было перавезена ў Маскву, дзе і стала асновай для стварэння «Верхняй» друкарні Сімяона Полацкага[26]. Туды ж перабраліся і некаторыя майстры з Куцейна. Асобныя друкары і мастакі былі запрошаны асабіста Сімяонам Полацкім – як напрыклад, яго сябар і знакаміты расійскі мастак Сямён Ушакоў.



*Рождение Петра Великого. Гравюра к иллюстрированному изданию «История Государства Российского» Н.М. Карамзина (Петербург, 1836)*

*Нараджэнне Пятра Вялікага. Гравюра да ілюстраванага выдання «История Государства Российского» М.М. Карамзіна (Пецярбург, 1836)*

*The birth of Peter the Great. Woodcut illustration for the publication «The History of the Russian State» by N. Karamzin (St. Petersburg, 1836)*

У выніку сваёй дзейнасці друкарня выпусціла шэсць выданняў, пераважна твораў, напісаных самім Сімяонам Полацкім. Важна таксама дадаць, што Сімяон Полацкі з вялікай павагаю ставіўся да кніг, збіраў іх на працягу ўсяго жыцця, у выніку чаго ім была сабрана адна з найлепшых у краіне бібліятэк. Сімяон завяшчаў яе чатыром манастырам Беларусі, Расіі і Украіны, аднакяго воля выканана не была[27].

Памёр Сімяон Полацкі раптоўна 25 жніўня 1680 г. на 51 годзе жыцця. Пахавалі яго ў Заіконаспас-

---

[24] Краткая литературная энциклопедия : [в 9 т. / главный редактор А. А. Сурков]. – Москва : Советская энциклопедия, 1971. – Т. 6. – Стб. 842.

[25] *Абецедарский Л. С.* Белорусы в Москве: XVII в.: из истории русско-белорусских связей / БГУ им. В. И. Ленина. – Минск : Издательство Белгосуниверситета им. В. И. Ленина, 1957. – С. 47.

[26] *Абецедарский Л. С.* Белорусы в Москве: XVII в.: из истории русско-белорусских связей / БГУ им. В. И. Ленина. – Минск : Издательство Белгосуниверситета им. В. И. Ленина, 1957. – С. 47–48.

[27] *Шумовіч А. У.* Экспазіцыя Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага як адлюстраванне жыцця і дзейнасці Сімяона Полацкага // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць (матэрыялы III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 19–20 лістапада 2009 г.): да 380-годдзя Сімяона Полацкага / [укладальнікі: А. У. Шумовіч, В. А. Шульчанка]. – Полацк, 2010. – С. 207.

кім манастыры ў Маскве, а каля магілы паставілі дзве каменныя стэлы з вялікай эпітафіяй, якую напісаў Сільвестр Мядзведзеў і якая пачыналася наступнымі словамі:

*Зряй, человече! Сей гроб, сердцем умилися,*
*о смерти учителя славна прослезися.*
*Учитель бо зде токмо один таков бывый,*
*богослов правый, церкве догмата хранивый,*
*Муж благоверный, церкви и царству потребный,*
*проповедию слова народу полезный,*
*Симеон Петровский, от всех верных любимый,*
*за смиренномудрие преудивляемый.*
*Им же польза верные люди насаждала,*
*незлобие же, тихость, кротость удивляла,*
*В нем же вера, надежда, любы пребываше,*
*молитва, милостыня, пост ся водворяше...*

## Творчы шлях Сімяона Полацкага

Займацца літаратурнай творчасцю Сімяон Полацкі пачаў яшчэ ў маладосці. Самыя раннія паэтычныя творы датуюцца канцом 1640-х гг. (час навучання ў Кіеве). Яны носяць павучальна-рэлігійны характар, напісаны ў традыцыях панегірычнай паэзіі. У ранніх вершах Сімяона закранаюцца праблемы чалавечай маралі, працы, гуманізму, мастацтва, дзяржаўнай улады і г. д.[28]

Большасць польскіх і лацінскіх вершаў Сімяона Полацкага, якія былі створаны падчас яго навучання ў Кіеве і Вільні, належаць да так званай школьнай паэзіі: гэта «перакладыроўка» тагачаснай універсітэцкай навукі і маральнай філасофіі ў сістэму сілабічнай паэтыкі барочнага кірунку. Тады паэтычны талент пісьменніка выявіўся пераважна ў свецкай тэматыцы, кантраснай вобразнасці, спецыфічнай для паэтычнай культуры барока «паэтычнай дасціпнасці»[29]. У час знаходжання ў Полацкім Богаяўленскім манастыры, ён пісаў вершы на беларускай, польскай і лацінскай мовах, хоць не меў магчымасці іх надрукаваць (зборнік «Розныя вершы»).

Чалавек па натуры дзейсны, працавіты, Сімяон Полацкі выкарыстаў усе магчымасці для грамадскага і літаратурнага самавыяўлення. Былі ў яго жыцці хвіліны адзіноты і тугі, і тады пісаліся вершы-маленні элегічнага настрою. Напрыклад, у «Малітве ў час смутку» паэт просіць Бога вызваліць яго ад цяжкіх клопатаў і напасцяў. З прыходам Сімяона Полацкага вакол Полацкага Богаяўленскага манастыра згуртаваліся таленавітыя пісьменнікі, сярод іх і ранейшыя яго настаўнікі – Філафей Утчыцкі, Ігнацій Іяўлевіч, здольныя выхаванцы іх школы Васіль Яновіч, Сава Капусцін і інш. Гэта была, па сутнасці, полацкая школа беларускіх літаратараў і настаўнікаў, якая магла сапернічаць з тагачаснай Полацкай езуіцкай калегіяй.

Характэрныя рысы паэтычных твораў полацкага перыяду – патрыятызм, любоў і пашана да свайго народа, роднага горада і краю. Сярод твораў гэтага перыяду – элегічная малітва пра забранне цудатворнага абраза Багародзіцы з Полацка ў Маскву (1663), «Пралог да прападобнай маці Ефрасінні» (1663), у якіх паэт просіць святую заступніцу Беларусі дапамагчы вярнуць «в

[28] *Прашковіч М. І.* Вялікі сын Беларусі : да 300-годдзя пераезду Сімяона Полацкага ў Маскву // Беларусь. – 1964. – № 6. – С. 28.
[29] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 380.
[30] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 380–381.

страну Полотскую» народную святыню[30].

Пасля захопу Полаччыны расійскімі войскамі Сімяон напісаў шэраг codewaваных віншаванняў з нагоды магчымых захопаў маскоўскімі войскамі новых гарадоў і абрання Аляксея Міхайлавіча каралём Рэчы Паспалітай, а таксама сатырычных твораў супраць праціўнікаў Расіі.

Пазней у панегірычным стылі Сімяон Полацкі напісаў «Вершы да гасудара Аляксея Міхайлавіча Вялікія і Малыя і Белыя Русі самадзержца», «Вершы да гасударыні царыцы», «Вершы да гасудара царэвіча» і іншыя ўрачыстыя хваленні. Дзве польскамоўныя сатырычныя паэмы – «Адчай шведскага караля» і «Шведскі кароль шукае сваіх афіцэраў» (каля 1657–1660) – выкрывалі заваёўніцкую авантуру Карла Густава X і яго амбіцыі адносна захопу. Гэтыя і іншыя творы беларускага перыяду (камічная дэкламацыя «Вітанне богалюбівага епіскапа Каліста Полацкага і Віцебскага…», «Лякарства на грахі», «Вершы ўцешныя да асобы адзінай») сведчаць, што ён карыстаўся выяўленчымі сродкамі народнага смеху – гратэскам і травестацыяй. Адначасова Сімяон Полацкі выявіў свой паэтычны талент у жанрах пастаралі (калядная вершаваная драма па матывах Евангелля ад Лукі «Гутаркі пастухоўскія»), оды («Вершы да гасудара цара Аляксея Міхайлавіча...», «Вершы да гасударыні царыцы», «Вершы да гасудара царэвіча», «Прывітанне нованароджанай царэўне Марыі», «Віншаванне новаабранаму патрыярху»), элегіі («Малітва ў смутку», на польскай мове)[31]. Пад уплывам еўрапейскага барока Сімяон Полацкі паступова набліжаўся да



*Симеон Полоцкий. Вертоград многоцветный. Парадная рукопись*

*Сімяон Полацкі. Вертаград мнагацветны. Парадны рукапіс*

*Simeon Polotsky. Vertograd mnogocvetnyj (The Garden of Many Flowers). The ceremonial manuscript*

[31] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 381.


РУѲМОЛОГІОН
или
СТІХОСЛОВЪ
Содержѧй въ себѣ стіхи равномѣрно и красногласно сложенныѧ: различны нуждамъ приличныѧ.
Въ славу и честь Бга въ Троицѣ единагѡ. Пречистыѧ Бжіѧ Мтре, Стыхъ оугодниковъ Єѧ вѣрныхъ.
Въ пользу Юныхъ и старыхъ. Духовныхъ и мірскихъ различныхъ санѡвъ. Купнѡ по утѣху и оумиленіе. в благодарствіе. Похвалу, и прибыть. и прочаѧ.
Бжіею помощію Трудолюбіемъ многогрѣшнагѡ во Іеромонасѣхъ Сумеѡна Полоцкагѡ, въ различнаѧ лѣта и времена сложенныѧ. Потомъ же въ едино собраніе сочетанныѧ.
Въ лѣто ѿ созданіѧ міра, зрпз. ѿ рождества Бга во плоти. ахоѳ.

*Симеон Полоцкий. Рифмологион*

*Сімяон Полацкі. Рыфмалагіён*

*Simeon Polotsky. Rhymelogion*

юць, што ён быў зроблены для будучага імператара Пятра І, якому на той час было толькі сем гадоў[32]. Для падрыхтоўкі гэтай навучальнай кнігі аўтарам былі вывучаны іншыя, больш раннія выданні буквароў, у тым ліку і беларускія (першыя ў свеце кнігі пад назвай «Буквар» былі выдадзены менавіта беларускімі друкарамі). Асноўны змест «Буквара славянскай мовы» Сімяона Полацкага складалі тэксты Бібліі, праваслаўнага катэхізіса і важнейшыя малітвы, што было характэрна для большасці буквароў таго часу. Але перад тым быў змешчаны аўтарскі вершаваны зварот «Прадмова да юнакоў, якія жадаюць навучацца» і іншыя тэксты.

Асабліва высока насельніцтвам быў ацэнены «Псалтыр рыфмаваны», створаны на аснове біблейскай кнігі гімнаў і песняў, якія былі ўпершыню ў рускай літаратуры перакладзены Сімяонам Полацкім у вершаваную форму. Ужо праз пяць гадоў пасля выхаду кнігі яна была пакладзена на музыку дзякам Васілём Цітовым, што стала пачаткам свецкай вакальнай музыкі ў Расіі[33]. Гэта выданне карысталася вялікай папулярнасцю ў XVII–XVIII стст.

За палітычнай і царкоўнай барацьбой пісьменнік не забываў пра сваё наканаванне – літаратурную творчасць. Амаль штодзённа пісаў палову сшытка вершаў, п’ес, твораў прамоўніцкай прозы. Царкоўныя «словы» і казанні Сімяона Полацкага служылі падручнікам для рускіх епіскапаў і святароў ніжэйшых званняў. Яны склалі рукапісныя зборнікі пад назвамі «Абед душэўны» (1675) і «Вя-

сацыяльна-філасофскіх і гістарычных праблем.

У адкрытай уласнай друкарні выдаваў кнігі вучэбнага характару: «Буквар славянскай мовы», паэтычны пераклад папулярнай вучэбнай кнігі Сярэднявечча і ранняга Новага часу – «Псалтыр рыфмаваны» (з дадаткам вершаванага «Месяцаслова»). Навучальным дапаможнікам для царскіх дзяцей і вучняў пісьменніка стаў «Вянец веры кафалічнай», якім вельмі зацікавілася царэўна Соф’я (захаваўся нават верш, прысвечаны ўручэнню рукапіснай кнігі царэўне). Вялікую цікавасць меў таксама і «Буквар славянскай мовы». Мярку-

[32] *Батвіннік М.* Азбука на ўсе часы. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – С. 124.

[33] Краткая литературная энциклопедия : [в 9 т. / главный редактор А. А. Сурков]. – Москва : Советская энциклопедия, 1971. – Т. 6. – Стб. 842.

чэра душэўная» (1676). Кожны том – больш за 1500 старонак, што сведчыць пра надзвычайную працавітасць аўтара. Гэта быў узор высокага прамоўніцкага мастацтва ва ўсходнеславянскім рэгіёне, а таксама ўзор барочнай дасціпнасці і кантраснай вобразнасці[34].

У канцы 1670-х гг. Сімяон Полацкі склаў два зборнікі паэзіі – «Вертаград шматколерны» (увайшлі вершы грамадска-палітычнай, маральна-філасофскай, сямейна-бытавой тэматыкі) і «Рыфмалагіён, або Вершаслоў» (увайшлі творы патрыятычнага характару, напісаныя ў апошнія гады творчасці). Зборнік вершаў «Вертаград мнагацветны» называлі энцыклапедыяй па хрысціянскай сімволіцы, гісторыі, біялогіі, геаграфіі, антычнай міфалогіі, тэалогіі. Другі буйны зборнік «Рыфмалагіён » змяшчаў панегірычныя творы і элегічныя фрэны (плачы), напісаныя пад пэўную нагоду. Цыкл вершаў пад назвай «Фрэны, або Плачы» на смерць расійскай царыцы Марыі Ільінічны лічыцца адным з найлепшых прыкладаў творчасці Сімяона Полацкага. Таксама ў склад «Рыфмалагіёна» былі ўключаны ўзоры драматургічнай паэзіі, напісаныя для прыдворнага тэатра цара, – «Камедыя прытчы пра блуднага сына» і трагедыя «Пра Навухаданосара цара...». Лічыцца, што яго драматургічная творчасць стаяла ля вытокаў расійскага прафесійнага тэатра.

Творчасць Сімяона Полацкага істотна паўплывала на развіццё рускай літаратурнай мовы. Вядома, што напачатку ён пачаў пісаць на роднай беларускай мове і толькі пазней



*Симеон Полоцкий. Стихотворение-крест из «Благоприветствования» царю Алексею Михайловичу (Москва, 1665)*

*Сімяон Полацкі. Верш-крыж у віншавальным прывітанні цару Аляксею Міхайлавічу (Масква, 1665)*

*Simeon Polotsky. Poem in the form of cross with greetings to Tsar Alexei Mikhailovich (Moscow, 1665)*

звярнуўся да польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай. Ужо трапіўшы ў Маскву, спрабаваў вычысціць сваю мову, прыладкаваць яе да граматычных і лексічных нормаў расійскай версіі царкоўнаславянскай мовы. Пра гэта ён пісаў у прадмове да «Рыфмалагіёна»:

*Писах в начале по языку тому,*
*Иже свойственный бе моему дому.*
*Таже увидев много ползу быти,*
*Славенскому ся чистому учити.*
*Взях грамматику прилежах читати,*
*Бог же удобно даде ми ю знати…*

Сімяону Полацкаму сапраўды ўдалося істотна змяніць мову сваіх твораў, аднак нягледзячы на яго намаганні семантыка, фразеалогія і сінтаксіс заўважна аддзялялі яе ад сучаснай яму мовы маскоўскага грамадства[35]. Таму пры падрыхтоўцы

[34] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 382.

[35] *Виноградов В. В.* Очерки по истории русского литературного языка XVII–XIX веков. – Москва : Высшая школа, 1982. – 3-е изд. – С. 22, 29.



*Симеон Полоцкий. Орел Российский (Москва, 1667)*

*Сімяон Полацкі. Арол Расійскі (Масква, 1667)*

*Simeon Polotsky. The Russian Eagle (Moscow, 1667)*

твораў Сімяона Полацкага да друку рэдактары і выдаўцы (напрыклад, Сільвестр Мядзведзеў) істотна перапрацоўвалі тэксты беларускага пісьменніка[36].

У той жа час у моўным развіцці Расіі другой паловы XVII ст. назіраўся крызіс царкоўнаславянскай мовы, якая паступова выцяснялася народнымі гаворкамі і «ачышчалася» ад грэцызмаў і гебраізмаў. У выніку адбывалася станаўленне сучаснай літаратурнай рускай мовы. Як мяркуюць даследчыкі, такія змены адбыліся дзякуючы, у значнай ступені, беларуска-ўкраінскаму моўна-культурнаму ўплыву[37]. І найперш дзякуючы ўплыву Сімяона Полацкага: ён успрымаўся ў якасці пераўтваральніка рускай царкоўнаславянскай мовы, які імкнуўся да яе спрашчэння[38].

Пастаянна (пачынаючы з моманту пераезду ў Маскву і да канца жыцця) Сімяон Полацкі займаўся перакладчыцкай дзейнасцю. Перакладаў, пераважна, з польскай і лацінскай моў на царкоўнаславянскую, па-мастацку апрацоўваў літаратурныя творы. Пасля смерці ў 1675 г. яго былога настаўніка, рэдактара царкоўных кніг пры маскоўскім двары Эпіфанія Славінецкага Сімяон Полацкі падключыўся да перакладу на рускую мову Біблії. Ён быў пачынальнікам таго творчага перакладу, у якім дакладнасць спалучалася з літаратурным майстэрствам. «Грэкафілы» (пісьменнікі і царкоўныя дзеячы грэка-візантыйскай арыентацыі) не давяралі «лацінніку» і «заходніку» Сімяону Полацкаму, хоць паважалі яго талент і энцыклапедычную аду-

[36] *Виноградов В. В.* Очерки по истории русского литературного языка XVII–XIX веков. – Москва :Высшая школа, 1982. – 3-е изд. – С. 29–30.

[37] *Виноградов В. В.* Очерки по истории русского литературного языка XVII–XIX веков. – Москва : Высшая школа, 1982. – 3-е изд. – С. 22–25, 41.

[38] *Виноградов В. В.* Очерки по истории русского литературного языка XVII–XIX веков. – Москва : Высшая школа, 1982. – 3-е изд. – С. 29.



*Симеон Полоцкий. Орел Российский. Стихотворение в форме сердца (Москва, 1667)*

*Сімяон Полацкі. Арол Расійскі. Верш у форме сэрца (Масква, 1667)*

*Simeon Polotsky. The Russian Eagle. Poet in the form of a heart (Moscow, 1667)*

каванасць. Але гэтыя рознагалоссі не перашкаджалі яго сяброўству з Эпіфаніем Славінецкім. На смерць свайго настаўніка Сімяон Полацкі напісаў пяць эпітафій, упершыню ў рускай літаратуры скарыстаўшы гэты вершаваны жанр[39].

Стыль беларускага пісьменніка вылучае асаблівая барочная вытанчанасць. Багатая жанравая разнастайнасць твораў: оды, элегіі, гімны, казанні, панегірыкі, эпітафіі, плачы, загадкі і інш. Як адзначаў І.П. Яромін, у рускай літаратуры Сімяон Полацкі выступіў пачынальнікам «…той галіны мастацкай творчасці, якая да яго была амаль зусім не распрацавана, – паэзіі і драматургіі»[40].

Відавочна, што літаратурная і агульнакультурная праграма полацкага асветніка, накіраваная на кампраміснае далучэнне Расіі да еўрапейскага культурнага рэгіёна, паступова перамагала. На дварцовых абедах яго нярэдка садзілі на ганаровым месцы недалёка ад цара Аляксея Міхайлавіча, бацькі 12 дзяцей, выхаваннем і навучаннем якіх кіраваў «старац Сімяон». Захаваліся цікавыя запісы ў расходных кнігах «Казённага прыказа» (ведамства дзяржаўнай маёмасці), сярод якіх – запіс пра багаты падарунак Сімяону Полацкаму ад царэвіча Аляксея Аляксеевіча за яго працавітасць і самаахвярнасць. У Маскве ў адной сваёй асобе ён быў і «міністрам культуры», і «міністрам адукацыі», які сам «загадваў і сам жа выконваў загады»[41].

У творчасці Сімяона Полацкага ярка выразілася імкненне да сінтэзу ўсходніх і заходніх традыцый і дасягненняў кнігадрукавання, вершаскладання, навучання, нават пастулатаў веры, за што яго ў Расіі часта крытыкавалі і называлі заходнікам (крытыка Эпіфанія Славінецкага, Яўфімія Чудаўскага і інш.). Менавіта ў той

[39] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, Х – пачатак ХХ ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 382.

[40] *Ерёмин И. П.* Симеон Полоцкий – поэт и драматург // Симеон Полоцкий. Избранные сочинения / Подг. текста, статья и ком. И. П. Ерёмина. М. ; Л., 1953. С. 260.

[41] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, Х – пачатак ХХ ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 382.



*Печатный двор в Москве в XVII в., где печатались книги Симеона Полоцкого*

*Друкарскі двор у Маскве у XVII ст., дзе выдаваліся кнігі Сімяона Полацкага*

*Printing House in Moscow which published Simeon Polotsky's books. XVII century*

час распачыналася вялікая дыскусія паміж «лацціннікамі» і «грэкафіламі». Сімяон Полацкі ўсімі ўспрымаўся як лідэр першай групы, у складзе якой было нямала выхадцаў з Беларусі і Украіны. Патрыярх Якім, які спрыяў «грэкафілам» і адкрыта зайздросціў Сімяону Полацкаму, скардзіўся, што цар даручыў апошняму «всякая церковная дела писати». Справа даходзіла да канфліктаў з трагічным фіналам, пра што сведчыць лютае забойства стральцамі брата Сімяона Полацкага, манаха Трубчэўскага манастыра Ісакія, якое адбылося ў 1674 ці 1675 г. у манастыры неўзабаве пасля вяртання Ісакія з кіеўскага паломніцтва[42].

Літаратурная спадчына Сімяона Полацкага была яркай з'явай рускага барока – асноўнай плыні ў эстэтыцы і мастацкай культуры другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст. ва ўсходнеславянскім рэгіёне (у беларускім, як у цэлым у еўрапейскім мастацтве, барочны стыль выявіўся ў канцы XVI ст.). Такім чынам, дзякуючы дзейнасці выхадцаў з Беларусі і Украіны, у тым ліку Сімяона Полацкага, да барока далучылася культура Расіі, якая амаль не была знаёма з готыкай і рэнесансам. На ўсходнеславянскіх землях барока пачало распаўсюджвацца менавіта з Беларусі і аформілася тут у самабытную мастацкую школу. Ніводная ранейшая эпоха не дала беларускай культуры столькі яркіх імёнаў кнігавыдаўцоў, архітэктараў, партрэтыстаў, іканапісцаў, гравёраў і, безумоўна, пісьменнікаў.

У расійскай культуры барока ў поўнай меры стала першым агульнаеўрапейскім стылем, які

[42] *Званарова Л. У., Конан У. М.* Сімяон Полацкі // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – С. 382.



*Царский дворец в Московском кремле, где находилась Верхняя типография Симеона Полоцкого*

*Царскі палац у Маскоўскім Крамлі, дзе знаходзілася Верхняя друкарня Сімяона Полацкага*

*Tsar palace in the Moscow Kremlin where the printing house of Simeon Polotsky was placed*

шмат у чым стаў пераломным у эвалюцыі мастацкай творчасці. У выніку сінтэзу ўплываў Усходу і Захаду нараджалася новае, самабытнае, непадобнае на суседнія культуры. Для літаратуры барока характэрны такія рысы, як складанасць стылю, незвычайная вобразнасць, метафарычнасць, павышаная эмацыянальнасць. Можна таксама дадаць ускладненасць вобразаў, сюжэтаў і формы, парадаксальнасць, імкненне як мага больш здзівіць чытача, паўплываць на яго эмоцыі і пачуцці.

